# Справа выбару

Грамадска-адукацыйны праект

Модуль

1



# ДЭМАКРАТЫЯ

6 старонак

# ДЭМАКРАТЫЯ


ДЭМАКРАТЫЯ
СВАБОДА ДУМКІ І СУМЛЕННЯ
СВАБОДА ВЫКАЗВАННЯ МЕРКАВАННЯ
СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ І АСАЦЫЯЦЫЙ
ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА
ВЯРШЭНСТВА ПРАВА

# ПРЫНЦЫПЫ

Існуе шмат розных мадэляў дэмакратычнага кіравання ў свеце, і часам лягчэй зразумець дэмакратыю, калі разглядаць тое, што ёю не з’яўляецца.

Дэмакратыя — гэта не аўтакратыя ці дыктатура, калі кіруе адзін чалавек, і не алігархія, калі кіруе невялікая частка грамадства. Дэмакратыя не павінна быць «праўленнем большасці», калі гэта азначае, што будуць цалкам ігнаравацца інтарэсы меншасці.

## ДЭМАКРАТЫЯ — ГЭТА КІРАВАННЕ АД ІМЯ ЎСЯГО НАРОДА, ЯКОЕ АДПАВЯДАЕ ЯГО ВОЛІ

Урадавыя, міжурадавыя і няўрадавыя арганізацыі ўсё часцей падкрэсліваюць, што дэмакратыя не толькі важная сама па сабе, але з’яўляецца значным сродкам для дасягнення іншых мэтаў, такіх як эканамічнае развіццё, скарачэнне беднасці і абарона правоў чалавека.

Дэмакратыя — гэта не ўсё альбо нічога, а хутчэй зменлівы кантынуум. Краіны могуць быць больш ці менш дэмакратычнымі ў цэлым і больш ці менш дэмакратычнымі ў розных аспектах свайго палітычнага і грамадскага жыцця.

## ІДЭАЛЬНАЙ ДЭМАКРАТЫІ НЕ ІСНУЕ

Асноўнымі дэмакратычнымі прынцыпамі з’яўляюцца народны кантроль і палітычная роўнасць. Ва ўсе часы дэмакраты змагаліся, каб народны кантроль над прыняццем грамадскіх рашэнняў быў больш эфектыўным і больш інклюзіўным.

Каб ніхто не падпарадкоўваўся правілам, якія навязаныя іншымі людзьмі, народ павінен мець магчымасць кантраляваць свой уласны лёс.

А палітычная роўнасць азначае, што неабходна ліквідаваць манаполію эліты на прыняцце рашэнняў; пераадолець такія перашкоды, як пол, этнічная прыналежнасць, рэлігія, мова, клас, багацце і іншыя, для роўнага ажыццяўлення грамадзянскіх правоў.

У людзей павінны быць аднолькавыя магчымасці ўплываць на рашэнні, якія закранаюць грамадства.

# ПРЫНЦЫПЫ-2

У наш час існуе столькі розных формаў дэмакратыі, колькі ёсць дэмакратычных дзяржаў у свеце. Няма двух абсалютна аднолькавых сістэм, і ні адну сістэму не можна прыняць за ўзор.

Існуюць прэзідэнцкія і парламенцкія дэмакратыі, дэмакратыі, якія з'яўляюцца федэральнымі ці ўнітарнымі, дэмакратыі, якія выкарыстоўваюць прапарцыйную сістэму выбараў і тыя, дзе выкарыстоўваецца мажарытарная сістэма, ёсць дэмакратыі, якія з'яўляюцца манархіямі.

Сучасныя сістэмы дэмакратыі аб'ядноўвае ўдзел прадстаўнікоў народа. Замест таго, каб наўпрост удзельнічаць у заканатворчасці, сення мы выкарыстоўваем выбары для адбору прадстаўнікоў народа, якія будуць кіраваць ад яго імя.

**БЕЗ ВЫБАРАЎ
ДЭМАКРАТЫІ БЫЦЬ НЕ МОЖА**

Такая сістэма называецца прадстаўнічай дэмакратыяй. Яна можа прэтэндаваць на дэмакратычнасць, таму што яна, прынамсі ў пэўнай ступені, заснавана на двух прыведзеных вышэй прынцыпах: народным кантролі і роўнасці для ўсіх (адзін чалавек — адзін голас).

Людзі часта гавораць, што краіны «сталі» дэмакратыямі пасля таго, як пачалі праводзіць адносна свабодныя і адкрытыя выбары.

Аднак дэмакратыя мае перадумовай большае, чым проста справядлівыя выбары.

# ДЭМАКРАТЫЯ І ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

Сувязі паміж правамі чалавека і дэмакратыяй глыбокія і пры гэтым маюць двухбаковы характар: адно ў пэўнай ступені залежыць ад другога і з'яўляецца

няпоўным без яго. Дэмакратыя насамрэч з'яўляецца адзінай формай кіравання, якая адпавядае правам чалавека.

Перш за ўсё права прымаць удзел у кіраванні само па сабе з'яўляецца правам чалавека. У артыкуле 21 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (УДПЧ) гаворыцца, што «воля народа павінна быць асновай для ўлады ўрада».

ВОЛЯ НАРОДА ПАВІННА БЫЦЬ АСНОВАЙ ДЛЯ ЎЛАДЫ ЎРАДА

Аднак дэмакратыя няпоўная без дбайнага захавання правоў чалавека.

Сапраўдны ўдзел у кіраванні практычна немагчымы без павагі да асноўных правоў чалавека.

## 1. Свабода думкі, сумлення і рэлігіі

Арт. 18 УДПЧ

Гэта адно з першых правоў, якія маюць важнейшае значэнне ў дэмакратыі. Людзям неабходна мець магчымасць свабодна думаць, прытрымлівацца любых поглядаў, якія маюць важнае значэнне для іх, пры гэтым не быць за гэта пакаранымі.

На працягу гісторыі ўрады імкнуліся абмежаваць гэтае права, паколькі баяліся, што, калі людзі будуць думаць пра іншыя формы кіравання, гэта паставіць пад пагрозу існуючую сістэму.

Такім чынам, яны кідалі людзей у турму толькі за тое, што ў іх былі «няправільныя» думкі. (Такія людзі вядомыя як «вязні сумлення».)

Аднак грамадства без плюралізму поглядаў з'яўляецца не толькі нецярпімым, яно абмяжоўвае свае ўласныя магчымасці развівацца ў новых і «магчыма» больш дасканалых напрамках.

## 2. Свабода выказвання меркавання

Арт. 19 УДПЧ

Важна не толькі мець магчымасць думаць тое, што вы хочаце, але і публічна выказваць сваё меркаванне, незалежна ад таго, якім яно можа быць.

Калі людзям перашкаджаюць у абмеркаванні сваіх поглядаў з іншымі людзьмі ці ў тым, каб прадстаўляць іх у СМІ, як людзі могуць удзельнічаць у кіраванні краінай? Іх меркаванне будзе выключана з магчымых разгляданых альтэрнатыў.

### 3. Свабода мірных сходаў і асацыяцый
Арт. 20 УДПЧ

Гэтае права дазваляе абмяркоўваць ідэі з іншымі людзьмі, якія гэтага пажадаюць, ствараць групы па інтарэсах, або збірацца для таго, каб пратэставаць супраць рашэнняў, з якімі вы не згодныя.

Магчыма, такая дзейнасць часта не падабаецца ўладам; аднак надзвычай важна, каб розныя пункты гледжання станавіліся вядомыя і ўлічваліся.

І гэта — частка сутнасці дэмакратыі.

Усе гэтыя правы, уключаючы права на ўдзел ў кіраванні краінай, павінны быць даступнымі для роўнага карыстання імі без якога б там ні было адрознення, як, напрыклад, па прыкмеце расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых перакананняў, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, маёмаснага, саслоўнага ці іншага становішча.

Але любое парушэнне іншых правоў чалавека таксама паўплывае на тое, у якой ступені розныя людзі могуць прымаць удзел у кіраванні краінай.

Беднасць, дрэннае здароўе або адсутнасць жылля — усё гэта можа перашкодзіць таму, каб голас чалавека быў пачуты, і знізіць уплыў яго выбару ў параўнанні з іншымі людзьмі.

# ВЯРШЭНСТВА ПРАВА

Яшчэ адзін вельмі важны кампанент дэмакратыі — вяршэнства права. Правы чалавека, вяршэнства права і дэмакратыя ўзаемазвязаныя, ўзаемаўзмацняюць адзін аднаго і належаць да ўніверсальных і непадзельных асноўных каштоўнасцей міру.

Як у свой час тлумачыў Генеральны сакратар ААН Кофі Аннан, вяршэнства права —

гэта <...> прынцып кіравання, пры якім усе асобы, установы і арганізацыі, дзяржаўныя і прыватныя, уключаючы саму дзяржаву, нясуць адказнасць за законы, якія публічна абнародаваныя, аднолькава выконваюцца і прымаюцца незалежнымі судамі і якія адпавядаюць міжнародным нормам і стандартам правоў чалавека.

## СУДОВАЯ СІСТЭМА — НЕАБХОДНАЯ ЎМОВА ДЭМАКРАТЫІ

Вяршэнства права з'яўляецца фундаментальным прынцыпам ў большасці сучасных дэмакратый. Судовая ўлада, якая прымяняе закон да асобных выпадкаў, выступае абаронцам вяршэнства права.

Такім чынам, незалежная і належным чынам функцыянуючая судовая сістэма — неабходная ўмова вяршэнства права, а значыць, і дэмакратыі.

# ПАДСУМОЎВАЕМ

Без выбараў дэмакратыі быць не можа.

Аднак дэмакратыя мае на ўвазе большае, чым проста справядлівыя выбары.

Дэмакратыя — гэта ўдзел грамадзян у кіраванні сваёй дзяржавай.

Дэмакратыі бываюць розныя.

Асноўны спосаб удзелу — выбары, праз якія грамадзяне ўпаўнаважваюць сваіх прадстаўнікоў на кіраванне дзяржавай.

Дэмакратыя патрабуе павагі да асноўных правоў чалавека.

Свабода думкі і сумлення, свабода выказвання меркавання, свабода мірных сходаў, свабода асацыяцый — гэта асноўныя, хоць і не ўсе, правы чалавека.

Вяршэнства права — таксама адзін з падмуркаў дэмакратыі, а незалежная і належным чынам функцыянуючая судовая сістэма — неабходная ўмова вяршэнства права.

Грамадска-адукацыйны праект «Справа выбару»
vybar.org

Справа выбару